***Прыдатак як разнавіднасць азначэння** (8 клас) І варыянт*

*1.Адзначце нумары сказаў, у якіх ёсць прыдаткі:*
1) Хто не любіць красуні-вясны!
2) Гарадок стаяў на беразе невялічкай рэчкі.
3) О, як вясною Случчына цвіце!
4) Я стаю на беразе Нарачы.
5) Бор шуміць над ракою Арэсай.

*2.Дапоўніце фармулёўку:*
Пішуцца з вялікай літары і бяруцца ў двукоссе прыдаткі, што абазначаюць ____________________
________________________________________________________________________________

*3.Падкрэсліце ў сказах прыдаткі як члены сказа:*
1) Я чую заўжды сваю Бесядзь-раку і шчырыя, родныя матчыны словы.
2) Злева ад дарогі стаяў домік-прыгажун.
3) У часопісе "Полымя" надрукаваны многія раманы беларускіх пісьменнікаў.
4) На доўгія вёрсты-мілі раскінуў лес-волат шатры.
5) Чырвоным ліхтаром вісіць на краі неба планета Марс.

*4.Расстаўце ў сказах, дзе трэба, злучок ці двукоссе, падкрэсліце прыдаткі, укажыце іх значэнне:*
1) Бачу родныя ўзвышшы стройных волатаў дубоў ________________________________________
________________________________________________________________________________
2) Арганізацыя Маладняк налічвала каля пяцісот чалавек ___________________________________
________________________________________________________________________________
3) Пад птушыны крык і гоман, даўшы хвалям вольны ход, прыпадніме бацька Нёман на хрыбце магутны лёд ____________________________________________________________________
4) Я лісічак набраў каля сцежкі вяртухі ______________________________________________

*5.Складзіце і запішыце сказы з прыдаткамі і паяснёнымі словамі:*
Месяц-чараўнік; возера Нарач; п'еса "Паўлінка"; стадыён "Дынама"
________________________________________________________________________________
________________________________________________________________________________
________________________________________________________________________________
________________________________________________________________________________
________________________________________________________________________________
________________________________________________________________________________

***Прыдатак як разнавіднасць азначэння*** *(8 клас) II варыянт*

*1.Адзначце нумары сказаў, у якіх ёсць прыдаткі:*
1) Прыемна чалавеку вясновымі днямі глядзець на бела-ружовыя пялёсткі саду.
2) На берагах возера Дрысвяты вырасла гідраэлектрастанцыя.
3) Выдатна родзяць у нас бульба і лён-даўгунец.
4) Шумела возера разам з лесам ва ўсе поры года.
5) Нам песню-казку дораць верасы на дарагі ўспамін.

*2.Дапоўніце фармулёўку:*
Адзіночны прыдатак пішацца праз злучок, калі ______________________________________________

______________________________________________________________________________

*3.Падкрэсліце ў сказах прыдаткі як члены сказа:*
1) Над ціхай Свіслаччу-ракой зара вясенняя ірдзіцца.
2) Вада ў возеры Нарач безупынна напаўняецца крыніцамі.
3) Млечны Шлях над зоркай Вегай у небе зерне высяваў.
4) Коўдрай рачулку-шчабятуху клапатліва ўкрыў туман.
5) Вершы маладых паэтаў былі надрукаваны ў часопісе “Маладосць”.

*4.Расстаўце ў сказах, дзе трэба, злучок ці двукоссе, падкрэсліце прыдаткі, укажыце іх значэнне:*
1) Мацюта каваль зрабіў спецыяльныя рыдлёўкі, кашы ______________________________________

______________________________________________________________________________

2) Яшчэ гарэлі, быццам зоркі, маланкі кветкі ля дарог ______________________________________

______________________________________________________________________________

3) У кінатэатры Беларусь хутка будзе прэм’ера новага фільма ______________________________

______________________________________________________________________________

4) Сваю зелень красы дробналістай расплялі прыгажуні бярозы _____________________________

______________________________________________________________________________

*5.Складзіце і запішыце сказы з прыдаткамі і паяснёнымі словамі:*
Паэма “Новая зямля”; горад Полацк; фабрыка “Камунарка”; груша-дзічка

______________________________________________________________________________

______________________________________________________________________________

______________________________________________________________________________

______________________________________________________________________________

______________________________________________________________________________

______________________________________________________________________________